

# «Чаму святкуем дзень Рэфармацыі»

***Антоній Бокун,*** *пастар царквы "Ян Прадвеснік"*

Дзень Рэфармацыі - гэта дзень, у які мы ўспамінаем пра вялікія дзеянні Божыя. Гэта дзень, які з'яўляецца днём сведчання, у які мы нагадваем, як Бог дзейнічае ў жыцці канкрэтных людзей і народаў. **Ерам.6:16** "*Так кажа Гасподзь: спынецеся на шляхах вашых і разгледзьце, і распытайце пра шляхі старажытных, дзе шлях добры, і ідзеце па ім, і знойдзеце спакой душам вашым…*»". І таму мы звяртаемся да шляхоў старадаўніх, да эпохі Рэфармацыі, каб убачыць шлях, якім мы можам ісці.

Рэфармацыя гэта не нешта новае - гэта вяртанне да Біблійнага хрысціянства. У XVI стагоддзі унікальным было тое, што Слова Божае стала ўплываць не толькі на асобных людзей, не толькі на нейкія групы людзей, але на цэлыя народы. Тады хрысціянства перажывала не лепшыя часы, у многім падобныя на сённяшнія. Людзі шукалі нейкага збаўлення і царква прапаноўвала заплаціць за паперу з пячаткай, якая быццам бы збаўляла ад грахоў, але ніхто не шукаў Жывога Бога. І вось 31 кастрычніка 1517 года прагучаў голас аднаго чалавека, Мартіна Лютэра, каторы сказаў: "Людзі! Калі мы гаворым пра пакаянне, то гэта значыць, што мы сапраўды павінны каяцца. Не купляць індульгенцыі, а рэальна каяцца перад Госпадам. Нашае збаўленне залежыць не ад таго што ты заплаціў, ці выканаў нейкія рэлігійныя практыкаванні, а ад таго, ці верыш ты ў Бога, бо наша апраўданне прыходзіць праз веру!". І гэты голас сапраўды змяніў ход гісторыі і пачаўся вялікі працэсс аднаўлення царквы. Яшчэ адзін прапаведнік Жан Кальвін гаварыў пра тое, што Богу прыналежыць уся ўлада і няма нічога ў гэтым жыцці, што не падпарадкоўваецца Госпаду. Што б чалавек не рабіў, дзе б не быў, ён ходзіць заўсёды пад Богам.

***Асноўныя 5 прынцыпаў Рэфармацыі:***

***1. Толькі Біблія з'яўляецца аснаваннем*** для жыцця царквы, чалавека, грамадства! Гэта ёсць канечны аўтарытэт. Ўсё, што мы робім, мы павінны параўноўваць са Словам Божым.

***2. Толькі вера!*** Наша збаўленне, наша апраўданне не наша заслуга, а яно абапіраецца на веру ў Ісуса Хрыста. Толькі той, хто верыць, з'яўляецца збаўленым!

***3. Толькі ласка Божая, толькі мілата!*** Бог заўсёды выходзіць насустрач і першы робіць крок.

***4. Толькі Хрыстос!*** Няма ніякага іншага шляху збаўлення, як толькі Ісус Хрыстос!

***5. І толькі Богу слава!*** За ўсё, што адбываецца ў нашым жыцці мы заўсёды павінны славіць Бога!

І вось калі гэтымі простымі і знаёмымі словамі пачалі жыць цэлыя народы, то здарыліся вялізныя змены. Можна сказаць, што той свет, у якім мы жывем сёння, сфармаваны дзякуючы Рэфармацыі, дзякуючы Біблейнаму хрысціянству. На працягу некалькі

стагоддзяў еўрапейская і наша культуры будаваліся на прынцыпах праведнасці. І 10 запаведзяў рэальна ўвайшлі ў жыццё народаў, нядзеля сапраўды стала з'яўляцца нядзеляй, днём, які прысвечаны Госпаду. Развівалася адукацыя, навука. Людзі проста пачалі чытаць Біблію і сталі разумець, што гэты свет створаны Богам, створаны па пэўным законам. Пачалі даследавацца гэтыя законы, што дало пачатак сучасным навукам і тэхналогіям. Тое, што людзі сталі чытаць Пісанне і жыць паводле Слова Божага, нарадзіла пратэстанскую этыку працы, або Біблійную: не крадзі, кажы праўду, будзь верным свайму слову, 6 дзён працуй, а сёмы Госпаду. І гэта прынесла развіццё тым краінам, якія прынялі Рэфармацыю, стала штуршком для з'яўлення прамысловай рэвалюцыі. Таму што кожны чалавек, які верыць Бібліі, не можа марнаваць свае сілы, але мусіць па максімуму выкарыстоўваць свае магчымасці. І найбольш хрысціянская краіна Англія ў XVIII стагоддзі стала Радзімай прамысловай рэвалюцыі. Сучаснае аблічча Еўропы сфармавалася ў XVI стагоддзі. Біблія стала гучаць і чытацца на розных мовах. Дэмакратыя, вяршэнства закону бярэ свае карані ў Пісанні, так як Слова Божае ёсць асноўны закон, а астатнія выходзяць з Яго. Менавіта хрысціяне дабіліся таго, што было адменена рабства і з'явіліся правы чалавека, васьмігадзінны працоўны дзень, сацыяльная справядлівасць, ахова здароўя, клопат пра людзей. Менавіта пра ўсё гэта, што стварыла той свет, у якім мы сёння жывем, што стварыла Рэфармацыя, мы ўзгадваем у гэты дзень. Мы таксама ўзгадваем, што Бог рабіў у нашай краіне, бо XVI стагоддзе - гэта залаты век Беларусі, калі наш народ пайшоў за Госпадам і меў дабраслаўленне.

**Пс.107:33-43** "*Ён ператварае рэкі ў пустыню і крыніцы вады — у сушу, зямлю пладавітую — у саланчак, за бязбожнасьць тых, што жывуць на ёй. Ён ператварае пустыню ў возера, і зямлю высахлую — у крыніцу вады; і пасяляе там спрагненых, і яны будуюць горад, каб жыць у ім; засяваюць палеткі, садзяць вінаграднікі, якія родзяць ім багатыя плады. Ён дабраслаўляе іх, і яны вельмі памнажаюцца, і ў іх быдла ня менее. Паменшыліся яны, і ўпалі ад прыгнёту, гароты і скрухі; Ён вылівае зьняважу на князёў, і пакідае іх блукаць у пустыні, дзе дарог няма. А гаротнага выцягвае з гароты, і род ягоны памнажае, як статак авечак. Праведнікі бачаць гэта, і радуюцца, а ўсякае няверства засланяе вусны свае. Хто мудры, той заўважыць гэта, і зразумее ласку Госпада".*

Мы адзначаем дзень Рэфармацыі, узгадваем шляхі старадаўнія для таго, каб убачыць, што калі народ ідзе за Богам - прыходзіць дабраслаўленне, калі народ адступаецца ад Бога - прыходзіць праклён. Ёсць адзіны шлях - клікаць да Госпада ў бядзе сваёй, і Ён пачуе, і Ён выратуе, і Ён падніме! І хто мудры, той гэта ўбачыць, зразумее ласку Госпада і праславіць Яго!